Аляксей Галаскок

# Суд над сарокай





## Няхай добра рыфмуецца!

Прыгадваю першую сустрэчу з Аляксеем Пятровічам. Было гэта на пачатку 90-х гадоў. Дзверы аддзела пісем рэдакцыі райгазеты “Савецкае Палессе” адчыніліся і на парозе з’явіўся статны чалавек у вайсковым адзенні. Ветліва прывітаўся і павёў размову на чыстай беларускай мове. Расказаў, што любіць паэзію, цытаваў вершы Ларысы Геніюш і сціпла прамаўчаў пра тое, што ў ягонай душы напеўна кладуцца рыфмаваныя радкі. Яго ўласныя пачуцці, з’явы прыроды, падзеі мясцовага значэння – найчасцей жартоўна-гумарыстычныя бытавыя сцэнкі.

Вершы А.П.Галаскок прынёс пазней. Іх адразу прыкмецілі, ацанілі чытачы – нашы самыя непадкупныя крытыкі. Прыкмецілі – і палюбілі. За тое, што яны на сакавітай роднай мове, за тое што мае дар паднесці ў рыфмаваных радках даступна, трапна – дзе са смехам - жалем, дзе з дабразычлівым мяккім гумарам, тое, што многія з нас носяць у сэрцы, а выказаць не могуць. Розныя тэмы хвалююць Аляксея Пятровіча. І тое, што ён у сталым узросце пачаў пісаць вершы для дзяцей мяне не здзівіла. Мы, маючы ўнукаў, з вышыні пражытых гадоў разумеем дзетак па-іншаму, і шкадуем-любім іх іншай любоўю. І дзеткам-унукам стараемся дадаць тое, што не дадалі сваім дзецям, навучыць таму, чаму не паспелі навучыць у шалёным рытме жыцця іх бацькоў. Таму і вершы ў Аляксея Пятровіча для дзетак шчырыя, пранікнёныя - як чысты позірк адкрытых вочак хлопчыкаў і дзяўчынак, як іх летуценныя думкі, яшчэ не азмрочаныя чужой здрадай, выгодай. Думаю, няпроста пісаць вершы для дзяцей, хоць і даверлівыя асобы яны, але тонка адчуваюць у дарослых сапраўдную дабрыню і падробную. І фальшу, нават у вершы, не даруюць.

У паэзіі Галаскока яго няма, таму і спадабаліся яны дзецям. Хай жа і надалей Аляксею Пятровічу лёгка рыфмуецца, прыкмячаецца добрае, а удзячных чытачоў большае.

***М.Д.Шчаўкун – адказны сакратар і загадчык аддзела пісьмаў, маралі і грамадскай работы раённай газеты “Савецкае Палессе”***

***Кацярынцы і Данілку***
***Прысвячаю***

Бягуць насустрач мае ўнукі.
Крычаць здалёк: “Дзядуля, дзед!”
Працягваюць галінкі-рукі...
Які цудоўны гэты свет!



* * *

Унучка кажа: “Дзед мой родны,
Вельмі я цябе люблю,
Бо на малпу  ты падобны –
Цацку лепшую маю”.

Гавару маёй маленькай,
Што раней такім не быў.
Гэта я цяпер сівенькі
І змаршчынак шмат нажыў.

Потым здымак ёй у ручку
Свой падаў, дзе малады.
- Паглядзі на мяне ўнучка?
- Не, дзядуля, тут не ты”.

## Мая ўнучка

У добры час, у добрую хвіліну
Нам Бог усім падараваў
Дзяўчынку – нашу Кацярыну,
Якую вельмі  я чакаў.

Бягу я часта да дачушкі,
Ну крыху з ёй пагаманю.
А сам, паціху  да Кацюшкі –
На тварык, хоць мяльком зірну.

Расце маленькая пакрысе,
Калі я побач з ёй стаю,
Ды ўсё свае шукаю рысы,
А хоць каб кропельку маю!

Як падрасце, мы з ёю разам
Па сцежцы пойдзем на палеткі,
Пад вішняй пасядзім у садзе
І прынясём дахаты кветкі.

Увойдзем ціха, каб не чулі,
Паставім кветкі ў дзве вазы.
Ты – маме, я – тваёй бабулі,
Няхай стаяць букеты разам.

## Унучку Даніле

Унучак мой, нашчадак мілы
Расці дубочак наш хутчэй.
За рукі потым возьмемся, Даніла,
Пакрочым разам,  гэтак мне лягчэй.

Гляджу ў твае “бабуліныя” вочы
Блакітныя, як неба над зямлёй.
І сэрца маё радасна грукоча,
Што не згубіўся род славуты мой.

Хачу, каб быў ты добрым, чулым,
Мог заступіцца  за сваіх  сяброў.
Пра бацьку помніў і матулю,
І пра бабуль  сваіх, і пра дзядоў.

Мы з часам знікнем, адплывем бы хвалі
Як човен, не прывязаны знарок.
Ты ўсім кажы,  цябе б дзе не спыталі:
Акулаў я, але і Галаскок.

* * *

Любяць дробязь шчупакі,
А шпакі парэчкі,
Любяць чаплі-рыбакі
Пастаяць ля рэчкі.

Жаўрукі любяць спяваць,
Вепрукі – прылегчы
Пчолы любяць  мёд збіраць,
А вось хвалі – бегчы.

Крумкачы любяць сядзець,
Качкі – папляскацца
Любіць доўга спаць мядзведзь
Вераб’і – спрачацца.

Любіць воду з рэчкі браць
Без вядра вясёлка,
У небе любіць паміргаць
Вокам жоўтым зорка.

Людзям трэба ўсіх любіць
Сэрцам чалавечым,
Нам наканавана жыць
На зямлі не вечна.

**Ваня і Лена**

Ваня з Ленай у садку
Не падзеляць цацку.
Кожны ўзяў сабе ў руку
Вуха ў сабачкі.

Цягнуць вушы з усіх сіл
І таго не бачаць,
Што сабачка той ажыў
І ад болю плача.

Выпадкова ён забег
Да дзяцей у садзік.
Радасць думаў будзе, смех,
І з ім будуць ладзіць.

Дзецям трэба дружна жыць,
Лепей за суседзяў.
Не? Дык можна і злавіць
За вушы мядзведзя!



**Конь і сабака.**

Конь з сабакам. Во! Сябры!
Іх вадою не разліць.
Ад зары і да зары
Разам любяць пахадзіць.

Праўда, конь ступае важка:
Цягне плуг ці барану.
А сабака - небарачка
Толькі топча баразну.

Ён да працы не прывык.
Вартаваць яму зручней
Вось і высунуў язык,
Каб каню было лягчэй!..



## Мышка і кот

Кот за дзень стаміўся крышку,
Лёг на прыпечак і спіць.
Марыць ён назаўтра мышку:
Зранку злодзея злавіць.

А яна сачыла з норкі.
Калі кот засне, чакала.
І як учора, зноў з каморкі,
Пацягнула кусок сала.



**Певень**

Гусі гучна па балоце
Развражаюць, як ім жыць.
Певень жа сядзіць на плоце
І на курачак глядзіць.

З плоту пеўніку відаць
Луг зялёны і раку.
Любіць вельмі ён співаць
На ўвесь двор: “Ку-ка-рэ-ку!”

Крык яго ляціць да неба,
А каму ранкам уставаць
Лепш гадзінніка не трэба –
Пеўнік будзе паднімаць.



* * *

Жаба зранку:
“К-У- М” ды “К-У-М” –
Бусла запрашала,
Той падкраўся, яе – хрум,
Каб не махлявала.

У жабы розуму няма,
Не было ніколі,
Бо жыве бусла кума
На старой тапалі.



**Качкі**

Апусціўшы галаву,
Уверх задраўшы лапкі,
Хто скубе ў рацэ траву?
Ну, вядома - КАЧКІ!

Крыламі б’юць па вадзе
Быццам бы бялізну прачкі.
Не маўчаць яны нідзе,
Хто гэта? Вядома - КАЧКІ!

Раску смачную жуюць
Ды спрытней чым дзеці жвачкі.
Спрэчкі між сабой вядуць.
Хто гэта? Вядома - КАЧКІ!

У перавалачку ідуць
Быццам з карабля марачкі.
Горда голавы нясуць
Хто гэта? Вядома - КАЧКІ!

Сёння дзеці малайцы,
Бо рашылі ўсе задачкі.
Вы сапраўдныя “байцы”,
Бо вядома – вы не качкі.

**Суд над сарокай**
***(казка)***

Ля сцяжынак злева, справа,
На палянах, у бары
Заблішчалі ўраз аб’явы:
Запрашаем жыхары!”

А ніжэй драбней, выразна,
Чорнай фарбай крыху збоку:
Суд  адбудзецца паказны
Над зладзейкаю сарокай.

Суд  вясці згадзіўся філін,
У адвакаты  пойдзе  лось.
За працэсам сачыць пільна
Будзе страус  – важны госць.

- Запрашаем тых, хто ў лесе
Гадаваўся  ці жыве.
Мы не супраць нават прэсы,
Не хаваемся ў траве.

Заўтра звер і птушка кожна,
Ці слімак павінен нам
Свае крыўды, калі можна,
Расказаць лясным сябрам.



Пацярпеўшых прыйшло многа:
Ажно  лес пачаў трашчаць.
Філін бухнуў: “Ну, дык  з Богам!
Будзем суд распачынаць”...

- Запрашаю ўсіх: “Ку-гу!”
Калі ласка, жыхары
Сядзьце, і каб  ні гу-гу,
Заяц, першы  гавары!

-  Што казаць, – я нёс капусту,
Трэба мне сям’ю карміць.
А яна, каб жыць ёй пуста,
На мяне як закрычыць!..

Што ўкраў сусед-галуба?
Праўду мне хутчэй  кажы,
Бо  як лясну цябе дзюбай,
Стой на месцы, не дрыжы!



Я **с**палохаўся, ды ходу,
Кінуў смачны той качан.
Яна ўслед, - Не меў каб моды
Красці, шэры хуліган!

- Ну, даволі! – цыкнуў філін
І паправіў акуляры:
Жук рагаты чорна-сіні,

Будзеш ты другім, да пары.

А табе вось  чым, сарока,
Што сядзіць вунь на суку
І міргае  чорным  вокам,
Чым нашкодзіла  жуку?

Поўз я па траве шаўковай,
Дзеткам нёс нектар-расу.
А яна, быццам  падковай,
Хрась, мне дзюбай па вусу.

Каменем упаў ад болю.
Свой ласуначак згубіў.
Памаглі мне праўда, пчолы,
Мёду крыху ў іх набыў.

Хопіць, усё тут зразумела.
Ты, зязюля, ужо кажы:
- І яна мне назалела -
То ёй дай,  то пакажы.

У мяне забрала яйкі,
Абяцала - прынясу.
Абдурыла так, як зайку,
Як жука, што нёс расу...

- Ну, даволі, дзе тут вожык,

Доўга нам яго чакаць?
- Нёс грыбных я многа ножак
Насушыць хацеў,  схаваць.

А яна: - З якога боку,
Ты мае грыбы нясеш?
Гаспадар тут я, сарока,

І па-польску: “Пан, ты веж? *

Скінуў я на мох бухматы,
Свой набытак – карані.
І ні з чым пайшоў дахаты
Ад яе - Бог, барані...

- Хто яшчэ супраць сарокі?
Што вы толькі пра тугу?
Нам даволі гэтых склокаў,
Скончым спрэчкі, ўсё: - ку-гу!

Не! Не ўсё! Бо па закону,
Каб яго не парушаць,
З дуба каркнула варона:
- Слова трэба ласю  даць!



- Калі ласка, ягамосць,
Пачынайце вы прамову.
- Добра, - стукнуў рогам лось, -

За сароку скажу слова.

Заяц, што застаўся з дуляй,
Ён не з лугу нёс качан.
Памаўчы і ты, зязюля,
Усе  жыццё тваё - падман.

Ты свае заўсёды яйкі:
Употайкі другім кладзеш.
Не расказвай нам тут байкі,
Цябе слухаць – напляцеш.

А навошта, жук рагаты,
Шапацеў у той траве?
Поўзаў бы ля свае хаты,
Там збіраў расу дзятве.

- Хопіць, хопіць, што ён кажа ?!-
Зашумелі ўсе навокал.
Зараз лось яшчэ дакажа,
Што анёл у нас - сарока.

Ён за грошы, без разбору,
Будзе ўсіх абараняць.
Дайце слова пракурору,
Колькі будзе ён маўчаць?!

Пракурор – мядзведзь разважны,

Мы яго не ўспаміналі.
На паляну выйшаў важна:
- Тут сароку выкрывалі!

Філін, вепр, камар і конік
Зніклі,  мо на тры гадзіны,
Аб’явілі потым, - сёння
Наш прысуд будзе адзіны.

У лесе больш не жыць сароцы,
Хто ўбачыць яе - гнаць!
Хай жыве цяпер дзе хоча,
Раз не ўмее сябраваць.

З таго часу ўсе сарокі
Амаль ў лесе не жывуць.
Каля вёсак, недалёка,
Яны гнёзды сабе ўюць.



***<u>*Пан, ты веж?</u> - Пан ты ведаеш?***

# Загадкі

***Хлапчукі і вы, дзяўчаткі,***
***Сёння можа кожны з вас***
***Адгадаць мае загадкі.***
***Калі ласка, у добры час!***



Хатку на сабе нясе,
Выставіўшы рожкі.
І на кусцік запаўзе
Адпачыўшы трошкі.

(*Смоўж)*

Век траскоча, не змаўкае
Чорна-бела, чорна-вока,
Што ўкрадзе – у гняздо хавае,
Па зямлі бяжыць з падскокам.

(*Сарок*а)





Вецер іх збірае ў статкі.
З імі разам жыве гром.
Сыплюць на зямлю ападкі,
Яны вечарам і днём.

(*Хмары*)

Пад лістком і пад ігліцай,
І пад мох у лесе мяккі,
Брацік з роднаю сястрыцай
Пахавалі свае шапкі.

(*Грыбы)*



Летам над вадой лунае,
Любіць адпачыць у чароце.
Рыбку ўбачыць: уцякае,
Тая з’есці яе хоча.

(*Страказа*)

Ад яго ўцякаюць кошкі,
Ходзіць ноччу па двары.
А яшчэ ён любіць косткі,
Што даюць гаспадары.

(*Сабака*)



# Суд над сарокай

***Зборнік вершаў для дзяцей падрыхтаваны раённай дзіцячай бібліятэкай.***

***Складанне, кампютэрны набор В.Мініч***
***Афармленне А.Макатрэвіч***

***г.Ганцавічы, 2007г.***